ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дырэктар дзяржаунай установы культуры “Астравецкая раённая бібліятэка”
_______________Н.У.Ачарэтава
“ А ” _______________2025 года

# Праект
# філіяла “Дзіцячая бібліятэка”
# па рабоце з дзецьмі
# з абмежаванымі магчымасцямі здароўя
# “Ты ў гэтым свеце не адзін”
# на 2025 год

Астравец, 2025

## I. **Абгрунтаванне праекта:**

Дзеці ў Беларусі з'яуляюцца вялікай каштоўнасцю і прыярытэтнай для бібліятэк групай. Асаблівага падыхода ў гэтым плане патрабуюць дзеці з абмежаваным магчымасцямі здароўя, жыццё гэтых дзяцей ідзе ў складаных умовах, яно вельмі адрозніваецца ад вобраза жыцця і выхавання здаровых дзяцей.

Роля бібліятэкі ў жыцці асаблівых дзяцей вельмі важная. Для многіх з іх свет адкрываецца менавіта праз кнігу, якая заўсёды лічылася адным з сувязных звенняў паміж людзьмі пры перадачы жыццёвага вопыта. Кніга лечыць, падтрымлівае чытача, гарманізуе яго ўнутраны свет — і для такіх чытачоў бібліятэкі прадастаўляюць свае фонды.

Іншым дзецям, якія па шэрагу абставін не могуць чытаць самастойна і ўспрымаць прачытанае ўслых, бібліятэка дае магчымасць зносін з аднагодкамі і бібліятэкарамі. Прыцягвае іх да пасільнага ўдзелу ў разнастайных мерапрыемствах, якія праводзяцца ў бібліятэцы, арганізоўвае мерапрыемствы спецыяльна для такіх дзетак. Гэта ў пэўнай ступені папаўняе дэфіцыт дабрыні, дапамагае дзецям змагацца з пачуццём адзіноты, непаўнацэннасці. Для сваіх асаблівых чытачоў бібліятэка імкнецца стварыць магчымасць для развіцця, задавальнення іх духоўных і пазнавальных запатрабаванняў.

Бібліятэка як сацыяльны інстытут на сучасным этапе прызвана арганізоўваць умовы для бібліятэчна-інфармацыйнага абслугоўвання дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі здароўя, садзейнічае іх адукацыйнаму працэсу, творчаму і духоўнаму развіццю асобы, садзейнічае працэсу інтэграцыі гэтых дзяцей у грамадстве, забяспечвае атрыманне неабходнай інфармацыі ў розных галінах ведаў.

Адным з найбольш актуальных накірункаў праекта з'яуляецца рэабілітацыя дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі.

У час рэалізацыі праекта з дзецьмі з абмежаванымі магчымасцямі здароўя будуць выкарыстоўвацца разнастайныя формы работы, гульнёвыя праграмы, конкурсы, літаратурна-музычныя кампазіцыі, экскурсіі і інш.

## II. Мэта праекта:

Сацыяльная адаптацыя дзяцей-інвалідаў у сучасным грамадстве, садзейнічанне гарманічнаму развіццю асобы дзіцяці.

## III. **Задачы праекта:**

1. Арганізацыя бібліятэчнага абслугоўвання дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі здароўя;
2. Стварэнне умоў для развіцця духоўных і пазнавальных патрэб асаблівых дзяцей;

3. Прадастаўленне асаблівым дзецям магчымасці зносін з аднагодкамі;
4. Пошук новых форм і метадаў у рабоце з асаблівымі дзецьмі і іх бацькамі.

## IV. Партнёры бібліятэкі ў рэалізацыі праекта:

Карэкцыйныя 1-9 класы Астравецкага раённага цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі.

## V. Асноуныя мерапрыемствы:

| №. п/п | Пазва і форма мерапрыемства | Тэрмін выканання | Адказныя |
|---|---|---|---|
| 1 | “Вокруг света с книгой”: прэзентацыя кніжных навінак | студзень | В.Б.Мундуць Л.М.Сакалоўская |
| 2 | “Хочу раскрасить этот мир, чтоб злой герой в нём добрым был”: гадзіна творчасці | люты | В.Б.Мундуць Л.М.Сакалоўская |
| 3 | “Мамины руки”: майстар —клас па вырабу паштоўкі для маці (да Міжнарожднага дня 8 сакавіка) | сакавік | В.Б.Мундуць Л.М.Сакалоўская |
| 4 | “На библиотечной орбите”: агляд кніг пра космас і касманаўтыку | красавік | В.Б.Мундуць Л.М.Саколоўская |
| 5 | “Пусть всегда будет солнце” гульнёвая праграма | май | В.Б.Мундуць Л.М.Сакалоўская |
| 6 | “Должны смеятся дети” гульнёвая праграма (да Дня абароны дзяцей) | чэрвень | В.Б. Мундуць Л.М.Сакалоўская |
| 7 | “Миром управляет доброта”: прэзентацыя новых кніг (да Дня бібліятэк) | верасень | В.Б.Мундуць Л.М.Сакалоўская |
| 8 | “Поделись улыбкою своей! ”: майстар-клас па вырабах з прыродных матэрыялаў (да Дня маці і бацькі) | кастрычнік | В.Б.Мундуць Л.М.Сакалоўская |
| 9 | “Мой любімы казачны герой”: конкурс малюнкаў любімых казачных герояў | лістапад | В.Б.Мундуць Л.М.Сакалоўская |
| 10 | “В кругу друзей”: гульнёвая праграма (да Міжнароднага дня інвалідаў) | снежань | В- .Мундуць Л.М.Сакалоўская |

Загадчык філіяла “Дзіцячая бібліятэка” В.Б.Мундуць

Дырэктар Астравецкага РЦКРНіР А.Д.Авлас